# ДА 55-ГОДДЗЯ ВАЛЯНЦІНА МІХАЙЛАВІЧА СЕМЯНЯКІ



**Дарагі Валянцін Міхайлавіч!**

Факт супадзення Вашага 55-годдзя з Годам малой радзімы ў Беларусі бачыцца нам глыбока сімвалічным. Таму што менавіта родныя краявіды, дух Радзімы, яе гісторыя і культура натхняюць Вас на творчасць і працу, надаюць жыццёвых сіл, напаўняюць зместам Ваша паэтычнае жыццё. Вобраз Радзімы ў вашай паэзіі праяўляецца ў непарыўнай сувязі з вобразамі маці і жанчыны, якія сімвалізуюць галоўныя каштоўнасці чалавека – жыццё і каханне. Свет Вашай паэзіі ў поўнай меры адлюстроўвае памкненні Вашай душы – чалавека з народа, якому ўдалося дасягнуць шмат дзякуючы заўсёднаму апірышчу на свае карані, веры ў людзей, у непераможны дух беларусаў. Мы ведаем Вас як сумленнага чалавека, вернага сябра, адказнага працаўніка, добрага беларускага паэта. Ад усёй душы віншуем вас з 55-годдзем. Жадаем Вам і далей ісці па жыцці, адгукаючыся на покліч свайго сэрца, з гонарам несці ўскладзеную на Вас місію літаратара і дзяржаўнага дзеяча, якая гарманічна і эфектыўна сумяшчае гэтыя амплуа. Здароўя Вам і натхнення, яркіх уражанняў ад жыцця і невычэрпнай творчай энергіі на доўгія-доўгія гады!

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”

*10 ліпеня 2018 года*

